# УСПАМІНАЮ ТЫЯ ДАЛЁКІЯ ПАДЗЕІ…

## Успаміны А.У. Зданчука, ураджэнца в. Эймінаўцы

29 чэрвеня 1941 года ў вёску Эймінаўцы наехалі немцы…

І тут пачалася сапраўдная «курыная вайна». За дзень былі знішчаны ўсе куры.

Акупацыйная ўлада паступова ўстанаўлівалася. Невядома адкуль з'явіўся наш «стары знаёмы», былы солтыс пры польскім часе, Расінскі і адразу аб'явіў сябе старастам вёскі. Сям'я яго была вывезена за два дні да вайны. Ён застаўся адзін і пачаў рыхтавацца да помсты. Недзе праз тыдзень пасля прыходу немцаў у вёсцы пачуўся гул матацыклаў, машын, былі чуваць крыкі немцаў. Бацька паглядзеў у акно і ўбачыў, што яны вядуць нашага суседа, Міхаіла Зданчука, які быў у верасні 1939-га начальнікам атрада самабароны. Раптам у дзверы пастукалі. Мы вырашылі, што прыйшлі за бацькам, бо ён у 1940 годзе вучыўся на кароткатэрміновых бухгалтарскіх курсах. Калі дзверы адчынілі, некалькі фашыстаў забеглі, схапілі стол, крэслы і лаву. Стол паставілі каля хаты, а лаву - перад нашымі вокнамі. Побач ужо стаялі сагнаныя вяскоўцы. За стол селі некалькі немцаў. Адзін з іх добра размаўляў па-руску. У Міхаіла Зданчука спыталі, хто забіў ляснічага і яго намесніка. Той адказаў, што зрабіў гэта Уладзімір Прымачок. Некалькі немцаў разам з Расінскім паехалі за ім. А Зданчука прывязалі да лавы і пачалі біць рэменем і палкай. Потым прымусілі прабегчы праз шарэнгу салдат, якія білі яго чым прыйдзецца - рамянямі, палкамі, нагамі, кулакамі. Усё гэта я бачыў праз шчыліны ў сцяне калідора.

Прывялі Прымачка. Ён прызнаўся, што забіў ляснічага і яго намесніка, абараняючыся, бо яны пачалі страляць першымі. Немцы вырашылі расстраляць Уладзіміра. Загадалі яму ўзяць рыдлёўку і тут жа, на нашым падворку, выкапаць сабе магілу. Аднак праз нейкі час загадалі спыніцца. Так ён і стаяў з рыдлёўкай у руках. А тым часам допыт вяскоўцаў працягваўся. Падвялі жанчыну, Еўдакію Курмель. Расінскі сказаў, што страляў таксама і яе муж, а яна падносіла патроны. Наступным быў малады хлопец 18-19 год Іосіф Курмель, брат мужа Еўдакіі (муж яе ў 1940 годзе паехаў у Кузбас на шахту, там і загінуў). Расінскі сказаў, што ён даглядаў параненых чырвонаармейцаў, якія знаходзіліся ў школе. І так праз немца-перакладчыка, які быў следчым, прайшлі 50 чалавек. Усім ім Расінскі даваў сваю характарыстыку. Гэтых людзей таксама праганялі праз шарэнгу фашыстаў і білі. Многія з іх падалі.

Уладзіміра Прымачка пасадзілі ў машыну, адвезлі на месца, дзе былі пахаваны забітыя ім людзі, і расстралялі. А астатніх павезлі ў

Саколку. Пасля некалькіх дзён допытаў і збівання адвезлі за горад і загадалі капаць магілы...

У 1959 годзе я быў у Эйсмантаўскай школе па справах. Там прыбіральшчыцай працавала Еўдакія Курмель. Тады яна мне і расказала, што адбылося з арыштаванымі вяскоўцамі апасля.

- Капаем сабе магілы каля Саколкі. Я - крайняя. Раптам падыходзіць да мяне той самы немец-следчы і пытае: хто такі Расінскі? Я і адказала, што ён злодзей, бандыт. Што быў старастам пры паляках і здзекваўся над людзьмі. Вяскоўцы звярнуліся тады да прадстаўнікоў польскай улады, каб назначылі старастам другога. За гэта Расінскі цяпер і помсціць. А яшчэ менавіта ён выдаў палякам нямецкага парашутыста. Пасля гэтых маіх слоў у следчага ўзніклі сумненні наконт дзеянняў Расінскага. Усіх нас пасадзілі ў машыну і прывезлі назад у вёску.

Вось так, па шчасліваму выпадку, Еўдакія Курмель выратавала арыштаваных вяскоўцаў ад смерці. А Расінскага немцы вывезлі і далейшы яго лёс невядомы.

Анатолій Уладзіміравіч Зданчук, г. п. Вялікая Бераставіца,
2006 год.